ПЛАЦДАРМ
Сумесны праект рэдакцыі газеты «Звязда» і Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь
Выпуск № 5 (104)

Мемарыял

ЯК ВЯРТАЮЦЦА ІМЁНЫ

Дзякуючы беларускім ваенным пошукавікам

Шмат вайсковых таямніц хавае беларуская зямля. Стагоддзя не праходзіла, каб яе не раздзірала чарговая вайна, пакідаючы за сабой сотні тысяч ахвяр, а ў XX стагоддзі — і небяспечныя боепрыпасы, якія і дагэтуль знаходзяцца дзясяткамі тысяч. Задача ж сучаснікаў — па магчымасці выцягнуць з нябыту прозвішчы салдат і афіцэраў, у звестках аб якіх дагэтуль стаіць грыф «прапаў без вестак». Займаюцца гэтым беларускія ваенныя пошукавікі. Пра іх дзейнасць расказаў начальнік упраўлення па ўвекавечанні памяці абаронцаў Айчыны і ахвяр войнаў Узброеных сіл Беларусі палкоўнік Сяргей ВАРАНОВІЧ.

ПРА ГАСПАДАРА ПАВЕДАМІЦЬ МЕДАЛЬЁН. АЛЕ НЕ ЗАЎЖДЫ

— У нашай краіне палявыя пошукавыя работы, якія звязаны з раскопкамі пахаванняў вайскоўцаў і ахвяр войнаў, можа праводзіць толькі асабовы склад 52-га асобнага спецыялізаванага пошукавага батальёна, — заўважыў Сяргей Варановіч. — Пры ўзгадненні з нашым упраўленнем удзельнічаць у гэтай справе могуць таксама члены грамадскіх аб'яднанняў і звычайныя грамадзяне.

За мінулае дзесяцігоддзе нашы ваенныя пошукавікі знайшлі і перадалі для перапахавання мясцовым органам улады паркам больш чым 16 тысяч вайскоўцаў Чырвонай Арміі, якія загінулі падчас Вялікай Айчыннай вайны. Гэтая лічба супастаўная з насельніцтвам не самага малога раённага цэнтра. Пры гэтым летась з зямлі былі падняты астанкі 640 воінаў. Але гэтым задача пошукавікаў не абмяжоўваецца. Пасля падняцця астанкаў трэба высветліць, каму яны належаць. А вось гэта справа ўжо больш складаная.

З агучаных вышэй лічбаў мы змаглі ідэнтыфікаваць 1263 загінулых за мінулыя дзесяць гадоў, у тым ліку летась — 122. Агульная лічба на парадак меншая з аб'ектыўных прычын. На тое, як захаваліся астанкі, якія-небудзь прадметы, зброя і вайсковая амуніцыя, больш за ўсё ўплывае час. Усё-такі з часу апошніх баёў на тэрыторыі Беларусі хутка міне 76 гадоў. Сваё ўздзеянне аказваюць і глыбіня, на якой знойдзены астанкі, і стан глебы, і наяўнасць грунтовых водаў... Што да асабістых апазнавальных знакаў ваеннаслужачых, то вельмі важна, каб вечка футарала, у якім захоўваўся медальён, было вельмі добра закручана. Гэта спрыяе таму, каб папяровы ўкладыш не сатлеў і не згніў пад уздзеяннем разнастайных прыродных з'яў. Ну і, натуральна, немалаважна тое, наколькі ахайна сам папяровы ўкладыш быў скручаны і пакладзены ў металічную скрынку.

Напрыклад, на месцы пахавання астанкаў савецкіх ваеннапалонных у былым шталагу № 352 у сталічнай Масюкоўшчыне былі знойдзены восем медальёнаў. Два ўкладышы ўдалося выцягнуць амаль без страты тэксту. А вось трэці, на жаль, захаваўся толькі фрагментарна. Таму звесткі з яго прачытаць пакуль не ўдалося. Але мы не трацім надзеі, што ў нас у рэшце рэшт атрымаецца разгадаць гэтую таямніцу.

Але год ад году такіх знаходак, якія дазваляюць высветліць звесткі, становіцца ўсё меней. За апошнюю чвэрць стагоддзя было знойдзена ўсяго 76 узнагарод — медалёў і ордэнаў. Прычым летась — шэсць. Гэта былі па тры медалі «За адвагу» і «За баявыя заслугі». Па іх нумарах і ўдалося высветліць, каму яны належалі. А вось медальён — не гарантыя стапрацэнтнай ідэнтыфікацыі. Чамусьці ўкладышы знаходзяцца толькі ў траціне з 868 такіх знаходак. Ды і іх не заўсёды ўдаецца прачытаць. Напрыклад, летась 25 медальёнаў вярнулі з небыцця імёны ўсяго васьмі чалавек. Хто яшчэ 17 — мы можам толькі здагадвацца... Рэдка, але ўдаецца адшукаць падпісаныя прадметы — кацялкі, лыжкі, грабянцы. Але для нас, пошукавікаў, важна нават адно вернутае імя. І нам вельмі важна, што хай нават праз столькі гадоў, але сваякі даведваюцца пра лёс сваіх блізкіх...

77 ГАДОЎ НЕВЯДОМАСЦІ

Пошук сваякоў — гэта працэс у кожным разе ўнікальны. Можа прайсці некалькі месяцаў, калі ўдасца высветліць, дзе жывуць родныя і блізкія загінулага воіна. Але здараецца і так, што адказаць на гэтае пытанне ўдаецца літаральна на наступны дзень.

У красавіку 2018 года блізу вёскі Хамічы Рагачоўскага раёна былі знойдзены астанкі салдата Чырвонай Арміі. Высветліць яго асобу ўдалося вельмі лёгка — пры нябожчыку быў наглуха закрыты медальён, у якім захаваўся ўкладыш. Ён належаў 21-гадоваму камандзіру аддзялення сяржанту Івану Лямунову. Служыў ён у 61-й стралковай дывізіі, якая трапіла ў акружэнне ў жніўні 1941 года на паўднёвы ўсход ад Жлобіна. Выйсці з яго ўдалося толькі асобным групам.

Звесткі пра сваякоў былі ўстаноўлены праз суткі, — успамінае Сяргей Варановіч. — Іван Лямуноў нарадзіўся ў вёсцы Забярэзнік Хароўскага раёна Валагодскай вобласці. Яго сястра — Лізавета Пракоп'еўна — жыла ў пасёлку Хароўск. Парэшткі вайскоўца былі перададзены ў Расію і ўрачыста пахаваны на могілках сяла Міхайлаўскае — гэта цэнтр аднайменнага сельскага паселішча, у склад якога ўваходзіў Забярэзнік. Дзеяслоў тут ужыты ў мінулым часе не памылкова — яшчэ па выніках перапісу 2002 года ў гэтай вёсцы не было ніводнага пастаяннага насельніка.

Трэба зазначыць, што наша ўпраўленне і камандаванне 52-га пошукавага батальёна вось ужо 16 гадоў узаемадзейнічаюць з прадстаўніцтвам Народнага саюза Германіі па доглядзе за ваеннымі магіламі ў нашай краіне. Мы прытрымліваемся Жэнеўскіх канвенцый 1949 года і дапаўненняў да іх, і таму праводзіцца паступовая лакалізацыя пахавання нямецкіх салдат. Астанкі тых, хто служыў у вермахце, пераносяцца на двое зборных ваенных могілак. Усё гэта — за кошт нямецкага боку.

Што да Расіі, то наш 52-і пошукавы батальён супрацоўнічае з аналагічнай структурай ва Узброеных Сілах нашай усходняй суседкі — 90-м пошукавым батальёнам. Штогод супрацоўніцтва толькі ўмацоўваецца. А з 2015 года праводзяцца сумесныя палявыя пошукавыя работы. Напрыклад, летась пад Віцебскам былі знойдзены і перапахаваны астанкі двух вайскоўцаў Чырвонай Арміі, загінулых у 1943 годзе.

— Наша зямля з часоў вайны хавае шмат зброі. У пачатку гэтага года начальнік інжынерных войскаў Узброеных Сіл — начальнік упраўлення інжынерных войскаў Генеральнага штаба УС палкоўнік Андрэй Куракоў казаў, што летась Узброеныя Сілы знішчылі каля 11 тысяч выбуханебяспечных прадметаў. Як часта нашым пошукавікам трапляюцца такія небяспечныя знаходкі?

— За апошнія дваццаць пяць гадоў воіны 52-га батальёна знайшлі каля дзевяці тысяч мін, бомбаў і гранат. Прычым толькі летась іх колькасць зусім крыху не дацягнула да тысячы. Абясшкоджваннем такіх знаходак займаюцца спецыяльныя групы размініравання. А вось зброя знаходзіцца куды радзей. З 1995 года было выяўлена і перададзена органам Міністэрства ўнутраных спраў усяго 242 адзінкі стралковай зброі і 138 фрагментаў, а таксама больш за 37 тысяч патронаў рознага калібру.

ПАРТАЛ ПАМЯЦІ

— Як праходзіць работа з архівамі?

— Так, даследаванне інфармацыйных крыніц, у лік якіх уваходзяць архіўныя матэрыялы, — гэта неад'емная частка нашай работы. Супрацоўнікі нашага ўпраўлення і прадстаўнікі 52-га батальёна пастаянна працуюць з дакументамі, якія знаходзяцца ў Нацыянальным архіве Беларусі, а таксама ў абласных і занальных. Іншая справа, што з аб'ектыўных прычын асноўная маса неабходных дакументаў фізічна знаходзіцца ў Расіі. Апошні раз мы працавалі там грунтоўна ў 2007 годзе. Але цяпер у гэтым прамой неабходнасці і няма дзякуючы развіццю інтэрнэту. Цэнтральны архіў Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі размясціў сайты абагульненых банкаў даных. Гэта «Мемарыял», «Подзвіг народа», «Памяць народа». Быў нават створаны адмысловы інфармацыйны партал, прысвечаны памяці загінулых падчас Першай сусветнай вайны. У вольны доступ былі выкладзены архіўныя дакументы. Мы актыўна імі карыстаемся для таго, каб удакладніць інфармацыю аб меркаваных няўлічаных воінскіх пахаваннях у нашай краіне і лёсах загінулых.

— Атрымліваецца, што імёны вяртаюцца нават больш чым праз стагоддзе...

— Так, нам удалося высветліць імёны двух салдат Рускай імператарскай арміі, якія загінулі на нашых землях у 1916 годзе. Падчас пошукавых работ блізу вёскі Манькавічы знойдзены парэшткі 78 воінаў. Ключ да ідэнтыфікацыі далі дзве гільзы з запіскамі. Між іншым, на той час ім было 102 гады. Нам удалося высветліць, што яны належалі радавому Г. Зайцаву, які нарадзіўся ў Вяцкай губерні, і унтэр-афіцэру Ф. Бальшакову, ураджэнцу Цвярской губерні. Дзякуючы дакументам Расійскага дзяржаўнага ваенна-гістарычнага архіва мы высветлілі асобу яшчэ аднаго загінулага салдата. Гэта быў выхадзец з Курскай губерні, радавы Г. Палякоў. А звесткі на інфармацыйным партале «Памяці герояў Вялікай вайны 1914—1918 гадоў» раскрылі асобы яшчэ 34 загінулых. Агулам жа за чвэрць стагоддзя пошукавікі знайшлі астанкі звыш 4 тысяч салдат Рускай імператарскай арміі.

Больш за тое, дагэтуль сустракаюцца знаходкі з часоў яшчэ даўнейшай вайны — 1812 года. Вайскоўцы знайшлі парэшткі 45 салдат Рускай арміі і 442 — напалеонаўскай. Там жа з зямлі паднялі і фрагменты амуніцыі, гузікі, ядры ад гармат. А аднойчы пры даследаванні пахавання была знойдзена нават залатая манета намінала у адзін фрыдрыхсдор, адчаканеная ў 1777 годзе.

— Як вызначаецца месца будучых раскопак? З чаго пачынаецца пошук?

— У мінулыя гады асноўнай крыніцай ведаў былі відавочцы ваенных падзей. Вось толькі сёння ўсім з іх ужо далёка за 80. І год ад году іх, на жаль, становіцца меней з натуральных прычын. Але нярэдка інфармацыя пра месцы, дзе былі пахаваны чырвонаармейцы альбо забіты мірныя жыхары, перадаецца з пакалення ў пакаленне. Таму калі вы валодаеце такімі звесткамі, то звярніцеся ў ваенны камісарыят або райвыканкам. Там трэба будзе запоўніць спецыяльны інфармацыйны ліст. Пасля ўдакладнення дакумент трапляе ў 52-і асобны спецыялізаваны пошукавы батальён. Па выніках дасланых лістоў з розных рэгіёнаў Беларусі і складаецца план работы на пошукавы перыяд. Ён доўжыцца з сярэдзіны красавіка да кастрычніка. Пры гэтым перш чым пачынаць раскопкі, пошукавікі мусяць атрымаць дазвол ад мясцовых распарадчых і выканаўчых органаў.

...Заўсёды цяжка ўспамінаць правядзенне раскопак на пахаваннях савецкіх ваеннапалонных, якія загінулі ў нямецкіх лагерах. Нельга забыць запоўненыя астанкамі траншэі і ямы. А вось з асобных знаходак, акрамя гільзаў часоў Першай сусветнай вайны, запомніліся знойдзеныя ўзнагароды, па нумарах якіх і былі ўстаноўлены звесткі аб іх уладальніках. Напрыклад, у Калінкавіцкім раёне быў знойдзены ордэн Аляксандра Неўскага разам з астанкамі дзядзькі Героя Савецкага Саюза, касманаўта і лётчыка-выпрабавальніка Аляксандра Віктарэнкі. А ў Бабруйску сем гадоў таму была знойдзена яшчэ адна высокая ўзнагарода — ордэн Чырвонага Сцяга.

Беларусь памятае

СПРАВА ДЛЯ НАРОДНЫХ МСЦІЎЦАЎ

Пра партызанскія аперацыі — з першых вуснаў

Цяпер, калі пасля вайны мінула столькі гадоў, каштоўнасць аповеду яе жывых сведак толькі павышаецца. Свае ўспаміны ў рэдакцыю даслаў мінчанін Георгій АРЛОЎ. Ён нарадзіўся ў 1924 годзе на Барысаўшчыне. Падчас вайны партызаніў. У мірны час, ужо ў 1951-м, скончыў Беларускі політэхнічны інстытут, пасля чаго шчыраваў на ніве сельскай гаспадаркі. Кандыдат тэхнічных навук. Па кар'ернай лесвіцы дайшоў да пасады першага намесніка дырэктара Усесаюзнага навукова-даследчага і тэхналагічнага інстытута механізацыі сельскай гаспадаркі, быў дацэнтам Беларускага інстытута механізацыі сельскай гаспадаркі. Аўтар 60 навуковых прац, мае пяць пасведчанняў на вынаходніцтвы.

Аповед Георгія Арлова пра партызанскія аперацыі з першых вуснаў мы і прапануем сёння.

* * *

14 чэрвеня 1941 года адбыўся наш выпускны вечар у сярэдняй школе № 1 горада Барысава. Здавалася б, атэстат сталасці цяпер у кішэні і з ім адкрыты ўсе шляхі да цікавага жыцця і далейшай вучобы. Марам, аднак, не наканавана было спраўдзіцца. Праз тыдзень пачалася Вялікая Айчынная.

Яшчэ перад вайной мы ведалі, што фашызм наш люты вораг. Першыя месяцы акупацыі нашых гарадоў і вёсак пацвердзілі гэта. Пачаліся арышты і расстрэлы. У лагерах ваеннапалонных сотнямі і тысячамі марылі галоднай смерцю, куды людзей гналі калонамі і забівалі тых, хто фізічна не быў у стане ісці. Моладзь гналі ў Германію на катаржныя работы на заводах і ваенных будоўлях, дзе яны паміралі ад голаду і хвароб. Замест памерлых прывозілі іншую партыю. Сцены дамоў і пабудоў стракацелі аб'явамі з пагрозай расстрэлу пры непадпарадкаванні ўладам «новага парадку», за хаванне былых чырвонаармейцаў і камандзіраў, праслухоўванне радыё...

У такіх умовах дзейнічаў наш партызанскі атрад імя Фрунзэ ў Барысаўскім, Халопеніцкім, Крупскім, Бягомльскім раёнах. Адносіўся ён да брыгады імя Кірава.

Наша сям'я сышла туды ў адну з летніх начэй 1943 года з вёскі Неманіца, што месціцца за сем кіламетраў ад Барысава. Агулам нас было каля дваццаці сем'яў — мы, Арловы, Ясюкі, Ляўданскія, Клімковічы, Хоравы, Буйло, Бяганскія, Паляковы, Серафімовічы... На жаль, праз столькі гадоў ужо не памятаю ўсе прозвішчы. Сышлі мы, кінуўшы хаты, увесь скарб, жывёлу. Паклалі толькі на вазы самае неабходнае і... пайшлі ў цемру, у смяротную небяспеку. Мы пакідалі вёску з вялікай рызыкай быць схопленымі ўжо на гэтым этапе, бо, акрамя паліцэйскага гарнізона, сюды прыйшла нямецкая часць з фронту. Таму прабіраліся ўначы агародамі.

У найбліжэйшым лесе нас сустрэў камісар атрада Ігнат Панкевіч з групай партызанаў, якія ведалі дарогу ў атрад па кантралюемай немцамі тэрыторыі. Цяжкі шлях заняў ажно трое сутак. Ішлі мы начамі па лесе, бездаражы, увесь час рызыкуючы патрапіць на варожыя засады, абыходзячы гарнізоны. Ад стомы падалі жанчыны, дзеці, коні. Але нейкім цудам усё ж атрымалася вывезці з паліцэйскага гарнізона ў вёсцы амаль усю зброю і боепрыпасы. Пасля трох сутак дарогі, знясіленыя, мы прыбылі на базу атрада. Месцілася яна на адным з астравоў сярод балот каля возера Палік і фактычна ўяўляла сабой групу зямлянак.

Такім чынам, мы прыйшлі ў атрад не з пустымі рукамі. І партызаны мелі ў зброі вельмі вялікую патрэбу. З нас, неманіцкіх, быў утвораны асобны трэці ўзвод атрада. Яшчэ два былі створаны з уцекачоў з нямецкага палону армейцаў і з дэсантнікаў.

Неўзабаве мы выйшлі ў знаёмыя родныя мясціны на першае баявое заданне. На шашы Мінск — Масква за месяц засадных баёў і раптоўных нападаў пры дапамозе супрацьтанкавых гранат і пры падтрымцы агнём з вінтовак і кулямётаў было знішчана 27 нямецкіх аўтамашын. Я ўваходзіў у дыверсійную групу, якая складалася з шасці чалавек. На балоцістым участку шашы Мінск — Масква за пяць кіламетраў ад Барысава быў узарваны мост-труба. Аб'езды мы загадзя замініравалі. Нямецкія машыны накіраваліся туды і... падарваліся на мінах. Рух на некалькі начных гадзін быў сарваны на самай важнай для праціўніка транспартнай артэрыі да фронту.

Падчас гэтага ж выхаду атрада на баявыя дзеянні ў наваколлі пад Барысавам мы з сябрам па школе атрымалі тол і ўзрывальнік, тут жа ў лесе змайстравалі самаробную міну, пайшлі па знаёмых са школьных гадоў дарожках на заданне. Устанавілі на грунтовай дарозе міну, на якой крыху пасля падарвалася нямецкая аўтамашына з салдатамі. Хаваючыся ад патрулёў, выразалі вялікі кавалак наземнага тэлефоннага дроту, у некалькіх месцах адкапалі і перарэзалі шматжыльны падземны кабель. Пасля аказалася, што тым самым мы на некалькі гадзін перапынілі сувязь стаўкі Гітлера з Цэнтральным фронтам. Пасля вяртання атрада на базу нам была аб'яўлена падзяка з далейшым прадстаўленнем да ўрадавай узнагароды.

Мы зрывалі работу нямецкай акупацыйнай адміністрацыі, вялі баі з карнікамі, якія спрабавалі прарвацца ў партызанскую зону, разграмілі два паліцэйскія гарнізоны, вялі разведку з перадачай звестак па рацыі за лінію фронту. Дзякуючы існаванню партызанскіх зон доўгі час з многіх вёсак немцы не маглі адправіць у Германію на прымусовыя работы ці ў канцлагер ніводнага чалавека.

...12 красавіка 1944 года наш атрад разам з іншымі падраздзяленнямі брыгады правёў паспяховы бой з немцамі каля вёскі Сялец. Брыгадай было знішчана каля 100 гітлераўцаў. На нашым участку разгаръўся самы жорсткі блізкі бой. Я ўдзельнічаў у ім у якасці кулямётчыка. Нямецкая куля зачапіла мяне.

Увогуле, да лета 1944 года ў нямецкім тыле ў Беларусі дзейнічала ўжо шматтысячная партызанская армія. Яна стварала пастаянную вялікую пагрозу ўдару па нямецкай лініі абароны «ззаду». Нямецкае камандаванне перакінула на барацьбу з партызанамі некалькі дывізій. Вораг быў узброены моцна, і таму мы з баямі адыходзілі да возера Палік. У блакадных баях у балотах скончыліся боепрыпасы, не было харчавання, медыкаментаў.

Рабіць нічога іншага не заставалася, і наша брыгада вырашыла ісці на прарыў. Але радыст злавіў у эфіры вестку пра тое, што пачалася аперацыя «Баграціён». Мы выйшлі да дарогі Халопенічы—Бягомль, каб атакаваць нямецкія часці. Але замест чарговага бою адбылася сустрэча з перадавымі танкавымі часцямі Чырвонай Арміі. Яны свабодна прайшлі па нашай партызанскай зоне, каб акружыць немцаў пад Мінскам — партызаны не далі фашыстам пабудаваць умацаванні. Было гэта 28 чэрвеня 1944 года.

Разам са мной ваяваў і бацька, Васіль Нічыпаравіч Арлоў. Камандзір атрада Мікалай Курсевіч ў асабістым лісце па ўліку партызанскіх кадраў запісаў: «Знаходзячыся ў партызанскім атрадзе, таварыш Арлоў В. М. да даручаных заданняў ставіўся добрасумленна. Удзельнічаў у баях атрада ў Барысаўскім раёне на магістралі Масква — Мінск у кастрычніку 1943 года. А таксама ў лютым 1944 года ўдзельнічаў і вызначыўся ў баях супраць карнай экспедыцыі пад вёскамі Жартай і Макееўшчына. Адданы справе вызвалення Радзімы ад нямецкіх акупантаў».

Бацька ў дзень сустрэчы з часцямі Чырвонай Арміі знаходзіўся не ў атрадзе. Ён накіраваў дакладную камандзіру з партызанам, які вяртаўся ў атрад, і пайшоў разам з нашымі салдатамі біць ворага далей. У часы Грамадзянскай вайны ён быў артылерыстам, досвед тых часоў спатрэбіўся і праз чвэрць стагоддзя. Толькі цяпер ён ужо адбіваў атакі танкаў. У адным з лістоў-трыкутнікаў бацька з фронту пісаў: «Ляжу на дне акопа. Артылерыйскі налёт. Атрасаю з ліста пясок і зямлю ад разрыву снарадаў і пішу». Чыталі мы гэты ліст, і рукі дрыжалі — а ці не накрыў пры чарговым артналёце нейкі снарад акоп з бацькам. Тройчы ён быў паранены, у тым ліку цяжка — падчас штурму Кёнігсберга.

Разам з усімі пераможцамі вярнуўся да любімай жонкі і дзяцей. На групавым здымку бацька ў пілотцы ў другім шэрагу. Побач — мама і сястра. Мой брат Саша перад вайной знаходзіўся на лячэнні ў санаторыі ў Еўпаторыі, што месціцца ў Крыме. Морам, а потым пешшу праз Каўказскія горы падлеткаў пераправілі далей ад баявых дзеянняў. Ён пайшоў працаваць на нафтапромыслы ў Азербайджане. Адно з радовішчаў выратаваў ад вялікага пажару і быў за гэта ўзнагароджаны.

Ваенныя супраць каранавіруса

У канцы мінулага тыдня зводны батальён радыяцыйнай, хімічнай і біялагічнай абароны праводзіў дэзынфекцыю на тэрыторыі ААТ «БелАЗ», што ў Жодзіне. Пра гэта паведамілі ў прэс-службе ваеннага ведамства.

Вайскоўцы апрацавалі тэрыторыю прадпрыемства, а таксама ўнутраныя памяшканні і вытворчыя цэхі. У сваёй работе яны выкарыстоўваюць узбранне і сродкі радыяцыйнай, хімічнай і біялагічнай абароны. У іх лік уваходзяць парагенератары і апараты высокага ціску.

— Батальён выканаў дэзынфекцыйныя работы на плошчы больш чым у 740 тысяч квадратных метраў, — паведамілі ў Міністэрстве абароны. — Іх складаюць аб'екты ўстаноў аховы здароўя, адукацыі, працы і сацыяльнай абароны, а таксама Міністэрства ўнутраных спраў і, канешне ж, Узброеных Сіл. Праз апрацоўку прайшлі таксама 317 аўтамабіляў хуткай медыцынскай дапамогі.

Высокае майстэрства

На палігоне Лосвіда ў Віцебскім раёне больш за сто вайскоўцаў будуць змагацца за права насіць нагрудны знак «Доблесць і майстэрства», паведамляе Міністэрства абароны Беларусі.

Каля сотні ваеннаслужачых чакаюць сем этапаў складаных кваліфікацыйных выпрабаванняў. Сярод іх — нарматывы па паветрана-дэсантнай падрыхтоўцы і тэсціраванне па прадметах баявой і спецыяльнай падрыхтоўкі. За плячыма іх — таксама і трэніроўкі перад скачкамі.

Таксама сярод удзельнікаў ёсць і жанчыны. Але прымуць удзел у спаборніцтвах яны ўсяго толькі трэці раз за ўвесь час.

Матэрыялы паласы падрыхтаваў Валяр'ян ШКЛЕННІК.